©ВДУ

# МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ А. АДАМОВІЧА, Г. БЁЛЯ, В. БОРХЕРТА: ДА ПРАБЛЕМЫ ТЫПАЛОГІІ

***Г. Ю. КОРШУН,*** **В. В. ЛАПАЦІНСКАЯ**

Investigation of Korchun A.Y. books devoted to the understanding of documentary journalism, "I come from a fiery village," "Book of the Siege," Novels "partisans", "Khatyn story" and other works by Ales Adamovich, who can be considered extremely relevant in our time. Specificity and innovative work is typological comparison with the works of the Belarusian author German writers, which made it possible to identify and study the important problem of the place of creativity in the world Ales Adamovich and cultural context, its role in the development of modern Belarusian literature

Ключавыя словы: проза, ідэйна-тэматычная разнастайнасць, жанр, стыль, тыпалагічны аналіз, вобраз, мастацкае асэнсаванне

Параўнальны аналіз твораў пісьменікаў, якія належаць да розных нацыянальнасцей, заўсёды будзе актуальным па прычыне таго, што пры тыпалагічным супастаўленні магчыма знайсці не толькі агульныя рысы (што сведчыць, у пэўнай ступені, пра пераемнасць, аднолькавае бачанне праблемы), але таксама і адрозныя, якія спрыяюць абмеркаванню пэўных праблем на іншым, напрыклад, рознанацыянальным узроўні. У працы мы звярнуліся да тыпалагічнага аналізу творчасці Алеся Адамовіча, Генрыха Бёля і Вольфганга Борхерта, гэта дазволіла выказаць думку, што нягледзячы на розную нацыянальную прыналежнасць пісьменнікі асуджаюць агрэсіўную, захопніцкую палітыку Германіі, лічаць, што вайна не прыносіць шчасця нікому: ні тым, хто яе пачынае, ні тым, хто вымушаны ў ёй удзельнічаць.

Так, калі для А. Адамовіча вайна – гэта катастрофа сусветнага маштабу, то для Г. Бёля – гэта злачынства, за якое кожны павінен адказваць персанальна і ў першую чаргу перад сваім сумленнем. Вайна ва ўяўленні В. Борхерта з’яўляецца пунктам адліку, арыенцірам для вымярэння гуманнага ў чалавеку. Аналізуемыя творы з’яўляюцца выкрывальнымі па сваёй сутнасці, бо асуджаюць антыгуманныя адносіны і перадаюць абсурднасць вайны, а праведзены іх тыпалагічны аналіз сведчыць пра тое, што:

1) творы Генрыха Бёля і Вольфганга Борхерта сталі этапнымі ў літаратуры Германіі ХХ стагоддзя (у так званы “час ноль ”). Гуманістычны і ў той жа час нігілістычны светапогляд – адметная рыса творчасці пісьменнікаў таго пакалення;

2) на прыкладзе твораў В. Борхерта можна сцвярджаць думку, што вайна не прыносіць шчасця нікому: ні тым, хто яе пачынае, ні тым, хто вымушаны ў ёй удзельнічаць. А творы пісьменніка з’яўляюцца выкрывальнымі па сваёй сутнасці, бо асуджаюць антыгуманныя адносіны і перадаюць абсурднасць вайны (апавяданні “Міма, міма”, “У маі кукавала зязюля”, “Шчуры ж ноччу спяць”, “Пруская Глорыя” і інш.);

3) творчы шлях Генрыха Бёля як мастака-рэаліста пачынаецца ў канцы 1940-х гадоў з жанру кароткага апавядання (Kurzgeschichte), у межах якога фарміруецца творчая індывідуальнасць пісьменніка. Творы пісьменніка на ваенную тэматыку вызначаюцца праўдзівасцю, рэалістычнасцю, імкненнем аб’ектыўна ацаніць праблему “нямецкай віны”;

4) пры тыпалагічным супастаўленні твораў А. Адамовіча, Г. Бёля і В. Борхерта выяўлены наступныя агульныя рысы: натуралізм адлюстраваных падзей, крытыка і асуджэнне агрэсіўнай захопніцкай палітыкі Германіі; аўтабіяграфізм некаторых твораў (апавяданне “Тогда в Одессе”, аповесць “Поезд пришел вовремя” Г. Бёля, дылогія “Партызаны” А. Адамовіча); упэўненасць у тым, што ў любой складанай сітуацыі выбар залежыць ад чалавека; цесная сувязь мінулага і сучаснасці.

Такім чынам, кожны з вышэйназваных пісьменнікаў аналізуе падзеі Вялікай Айчыннай вайны на філасофска-аналітычным і сацыяльна-псіхалагічным узроўнях, што сведчыць пра глабальнасць праблемы вайны і міру.